# Прэзідэнт Беларусі азнаёміўся з ходам работ па ўзвядзенню Нацыянальнай бібліятэкі

**Аляксандр Лукашэнка даручыў прадоўжыць работы па шкленню вышыннага кнігасховішча новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі краіны. Сёння кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з ходам работ па ўзвядзенню бібліятэкі. Наведванне прэзідэнтам будаўнічай пляцоўкі не было запланавана.**

Аляксандру Лукашэнку былі прадстаўлены розныя адценні шкла, якія прапануюцца для знешняй аддзелкі будынка бібліятэкі. Кіраўнік дзяржавы, азнаёміўшыся з многімі варыянтамі, распарадзіўся прадоўжыць мантажныя работы і шкленне вышыннага кнігасховішча празрыстым шклом, якое, паводле задумы праекціроўшчыкаў, сімвалізуе чыстую і светлую Беларусь. Пры гэтым паўпразрысты «алмаз» будзе адлюстроўваць у сабе ўсё багацце і непаўторнасць беларускай прыроды. Прэзідэнт адзначыў, што работа па завяршэнню важнага сацыяльнага аб'екта павінна быць напружанай. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў удзяліць асаблівую ўвагу якасці будаўніцтва і добраўпарадкаванню тэрыторыі. «Усё павінна быць ідэальна. Усё трэба рабіць як належыць і прыгожа», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў канцэпцыю стварэння ў Нацыянальнай бібліятэцы памяшкання для самітаў кіраўнікоў дзяржаў, якое не было прадугледжана першапачатковым праектам. Паводле слоў прэзідэнта, гэта дасць магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць існуючую свабодную прастору. На думку Аляксандра Лукашэнкі, такі варыянт з'яўляецца вельмі выгадным: калі будаваць дзесьці асобнае такое памяшканне для сустрэч на вышэйшым узроўні, то яно будзе каштаваць даражэй. Кіраўнік дзяржавы быў таксама праінфармаваны аб ходзе праектавання «Прэзідэнт-цэнтра», дзе будуць праводзіцца невялікія нарады, сімпозіумы і іншыя мерапрыемствы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**